тельный во времени и может включать несколько заданий: составление плана текста, выбор заголовка к тексту, заполнение пропусков, верные (неверные) утверждения. Студенты получают задание прочитать текст, выписать незнакомые слова с переводом, мешающие понять смысл абзаца, фразы, выделить основные проблемы, освещаемые в тексте, составить план пересказа текста. Студенты работают в микрогруппах. Читая текст, который подается на экран дисплея абзацами, студент может обращаться к ключам в момент затруднений в процессе чтения. При этом инструкция ориентирует его таким образом, чтобы к справочному аппарату он обращался только в случае, если без этого он не может понять содержание текста. После чтения текста студент сигнализирует о том, что работа закончена.

3. Послетекстовый этап.

Этот этап логически подводит студентов к интерпретации текста. На этом этапе осуществляется контроль понимания содержания текста и дается его интерпретация. Виды контроля:

1. Студенты читают выписанные слова, называют проблемы, которые они выделили в тексте, эти проблемы можно записать на доске:
- gang membership;
- underage drinking;
- violence, guns in schools;
- smoking;
- vehicular homicide;

2. Используя материал текста, студенты отвечают на вопросы преподавателя:
- Why are many poor children forced to sell drags or join gangs?
- Why are many young girls and boys brutally murdered?
- Do middle class and wealthy American teenagers also face many problems?
- How do the drags influence the teenagers?

На послетекстовом этапе информация уточняется и расширяется за счет ряда проблемно-поисковых заданий. По мере продвижения от текста к тексту количество опор будет постепенно убывать, пока студенты не научатся строить свернутую ориентировочную основу деятельности по раскрытию значения слова в соответствии с основным положением теории поэтапного формирования действий по П.Я. Гальперину об усвоении знаний посредством усвоения определенной системы адекватных действий.

Постепенно студенты учатся преодолевать разнообразные трудности в процессе чтения: понимать слово, образованное по конверсии, догадываться о его значении по контексту, не обращаться за помощью к компьютеру, когда незнакомое слово не содержит важной смысловой нагрузки и не играет существенной роли для понимания текста. Только небольшая часть лексики, недоступная для самостоятельного понимания, может переводится словарной статьей.

Работа над самостоятельным преодолением трудностей в процессе чтения предлагается студентам, обратившимся за помощью, самим определить тип трудности, с которой они столкнулись, и тем самым либо преодолеть её самостоятельно, либо получить помощь [6].

При обучении чтению с использованием компьютерных телекоммуникационных сетей происходит:
- формирование навыков установления звуко-буквенных соответствий;
- обучение технике чтения вслух;
- совершенствование навыков технике чтения за счет применения таких приемов, как варьирование поля восприятия и темпа предъявления, изменение расположения текста и т.д.;
- закрепление рецептивных лексических и грамматических навыков чтения;
- овладение умениями извлечения из текста смысловой информации различных видов (основной, второстепенной, уточняющей);
- обучение различным видам анализа текста;
- формирование умения самостоятельно преодолевать языковые трудности;
- оказание справочно-информационной поддержки путем предоставления языковой или экстралингвистической информации (за счёт использования автоматических словарей, электронных энциклопедий).

***Заключение.*** Заключая образ общего содержания изложенных в статье положений, подчеркиваю, что данная статья представляет собой анализ работы нашей кафедры по обучению чтению на иностранном языке с использованием компьютерных телекоммуникационных сетей. В ней освещена проблема обучения чтению с использованием Интернета и показано, что при компьютерной форме сохраняются все закономерности учебного процесса в том числе общие, отражаемые психолого-дидактические принципы: научности, доступности, активности, систематичности и последовательности, прочности усвоения, индивидуализации, наблюдательности.

Дается полная характеристика трем этапам работы над любым текстом: предтекстовому, текстовому и послетекстовому.

**СПИСОК ЦИТИРОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ**


1. Иностранные языки в школе. – № 2, 1989. - С. 36-39.
2. Иностранные языки в школе. – № 3, 2002 - с. 3.
3. Иностранные языки в школе. – № 3, 2001.- с. 14.
4. Иностранные языки в школе. – № 5, 1997. - С. 14-15.
5. Карамышева Т.В. Изучение иностранных языков с помощью компьютера. – Санкт - Петербург: Союз, 2001. - с. 75.
6. Ленская Е.А., Копылов П.Н. Компьютерное обучение чтению на иностранном языке: возможности и перспективы. Ин. яз. в школе №2, 1989. – с. 36.


*Материал поступил в редакцию 15.11.2007*


**TRIFONIUK A.F. Psychologic and didactic base of computer technologies in teaching students of Economic faculty to read in English**

Analising psychologic and pedagogic Literature, research work in some economic groups marks that the information technologies take a very important place in teaching English.

Using computer technologies and Internet we can state that all the main regularities of the educational process reflected in psychologic and didactic principles: scientific, activity, systematic character and sequence, individualization, observation.

The text in Internet determines the kind of reading. The text is usually divided in three stages; pretext, text and posttext.

The formed skills and habits arc described in detail in this article.


УДК 82:1 (=161)

***Ляўчук В.А.***

# ФІЛАСОФСКАЯ КАНЦЭПЦЫЯ ЧАЛАВЕКА Ў РЭНЕСАНСНАЙ І БАРОЧНАЙ ПАЭЗІІ БЕЛАРУСІ

***Уводзіны.*** Свае больш глыбокае развіццё філасофская паэзія Беларусі атрымала ў эпоху Адраджэння або Рэнесансу, гуманізацыі ўсіх сфер жыцця, фарміравання новага, рэнесансна-гуманістычнага светапогляду. Аснову гуманізму эпохі Адраджэння складаюць уяўленне пра самакаштоўнасць чалавечага жыцця, неабмежавання магчымасці чалавека ў адносінах да сябе самога, творчасці, пазнання свету, натуралізм у вытлумачэнні ўзаемаадносінаў чалавека з рэальнасцю. У адрозненне ад заходнееўрапейскага рэнесансны гуманізм Беларусі вызначаўся большай арыентацыяй філасофскай і эстэтычнай думкі на Біблію. Сведчанне таму - творчасць Францыска Скарыны, характэрнымі рысамі якой былі распаўсюджванне ведаў на роднай мове, новы падыход да вытлумачэння з'яў прыроды, больш актыўным заклікам да самасцвярджэння асобы чалавека, прыкаванай барацьбой супраць афіцыйнай царкоўнай ідэалогіі.

***Ляўчук В.А.**, асістэнт кафедры беларускага літаратуразнаўства БрДзУ імя А.С. Пушкіна.*

***Рэнесансная творчасць Ф.Скарыны.*** Ф.Скарына фарміраваўся адразу ва ўлонні дзвюх культур: грэка-візантыйскай і рымскай, заходняй і ўсходняй. Менавіта ён першы інтэнсіўна пачаў збліжаць літаратуры славянскага Ўсходу з заходнееўрапейскімі.

Як паэт Ф.Скарына застаецца малавядомым, а ён жа быў і таленавітым гімнолагам. «Скарына-празаік вядомы нам яшчэ вельмі і вельмі мала, Скарына-паэт пакуль невядомы зусім», - піша сучасны літаратуразнавец [10, с. 148]. Аднак не цяжка заўважыць, што ва ўсёй сваей творчасці аўтар схіляецца да паэзіі. Элементы верша, уведзеныя перакладчыкам у тэкст Бібліі, паэтычныя ўстаўкі празаіка ў тэксты прадмоў, надпісанняў і пасляслоўяў - першыя праяўленні схільнасці нашага славутага земляка да вершаскладання, якія затым разам з вопытам перакладу і апрацоўкі асветнікам гімналагічных твораў візантыйскіх паэтаў Іосіфа Бухіраса, Рамана Мілагучнага, Іосіфа Песняпісца стануць асновай для стварэння ўласных акафістаў і канонаў.

Асабліва заўважна празаічны тэкст набывае першыя элементы вершаванай будовы ў пасляслоўях да кнігі Суддзяў, да кнігі Царстваў, да кнігі Быццё, да кнігі Ісуса Навіна, да «Прытчаў Саламона», да Экклезіяста, да кнігі «Плач Ераміі». Названыя тэксты пасляслоўяў вылучаюцца рытмічнасцю, якая надае ім узвышана-ўрачыстае гучанне. Элементы старажытнай рыторыкі, перанос частак фразы на асобныя радкі з вытрыманай сінтаксічнай сіметрыяй спрыяюць арганізацыі тэксту ў незвычайную форму, якая нагадвае сабой перавёрнуты конус, іншымі разам нават усечаны.

То ест конець первых книг Моисеевых
Еже от еврей называются Брешис. По-гречески
же. И по-латыне именуется Енезеос. А по-руски
Бытья. Божиею помоцію зуполне выложены
и вытеснены. Повелением и пилностию
учёного мужа, в лекарских
науках доктора Франциска Скорины
с Полоцка. У великом
месте Празском. По
летех воплощения
слова Божия

Тысещного
Пятисотого
Девет
На 10:[1, с.111].

Рытміку і афарыстычную афарбоўку пэўнага біблейскага тэксту перадаюць уведзеныя аўтарам надпісы да раздзелаў кожнай кнігі Бібліі.

Починается книга пророка Божия Даниила.
Еже иудей написана ест
халдейским языком,
еврейскими словами.
А замыкаеть в собе
Глав 14: [1, с.705].

Аналізуючы прадмовы да твораў Ф.Скарыны, Юрый Лабынцаў, зазначае, што паасобныя фрагменты іх, запісаныя ў выглядзе звычайнай прозы, тым не менш з'яўляюцца амаль закончанымі вершамі, гімнамі. У доказ сказанаму аўтар робіць разбіўку на радкі "Прадмовы ў Псалтыр" [10, с.149]. Можна зрабіць падобную разбіўку і асобных фрагментаў прадмовы да "Прытчаў Саламона".

Есть бо в сих притчах сокрыта мудрость,
якобы моць в драгом камени,
и яко злато в земли, и ядро в ореху.
Кто ю знайдеть, сей знайде милость,
и достанеть блогословения от господа,
и приидеть к нему все доброе посполу с нею.
Хвала и честь бесчисленная моцию ея,
она убо есть мати всех добрых речей
и учитель всякому доброму учению [18, с.22].

Пераход інтанацыйна-сказавай моўнай плыні да больш арганізаваных структурных формаў пісьмовай мовы выявіўся у эпіграфе Скарыны да кнігі "Іоў", у прадмовах да кніг "Выхад", "Эсфір". Грунтоўным даследаваннем гэтых тэкстаў упершыню заняўся П.Н. Беркаў, які змясціў свой артыкул "Ф.Скарына і пачатак усходнеславянскага вершаскладання" у зборніку "450 год беларускага кнігадрукавання".

Эпіграф да кнігі "Іоў" напісаны вершам, які па сваей структуры набліжаны да сілабічных канонаў:

Богу в Троицы единому
Ко чти и ко славе,
Матери его пречистой
Марии к похвале,
Всем небесным силам и святым его к веселию,
Людем посполитым
К доброму научению [18, с.132].

Хваласпеў вызначаецца наяўнасцю дыдактычнай рыфмы «веселию - научению», аднолькавай колькасцю складоў у радках, набліжаны да публіцыстыкі.

Спецыфічны характар мае вершаваны выклад дзесяці запаведзяў у прадмове да кнігі «Выхад». Рыфма служыць тут, відаць, лепшаму запамінанню іх, хаця трэцяе двухрадкоўе «не забівай ни едина, и не делай греху блудна» [18, с.53] напісана сілабічным васьміскладовікам.

Прадмовы да кніг Бібліі, як і іншыя творы, сведчаць пра тое, што Ф.Скарына быў чалавекам шырокага кругагляду. Яго хвалявалі праблемы светапогляднага характару. Задумваецца ён і над тым, дзеля чаго жыве чалавек на зямлі, каму або якім рэчам ён здольны аддаць перавагу: мудрасці, навукам, сябрам, грамадству. Ці проста ўсяму таму, што ўзвышае ў людзях чалавечую сутнасць? Ці стаць нявольнікам, прыхільнікам нізкіх інстынктаў? Глыбокая заглыбленасць у характары людзей дапамагае аўтару патлумачыць, лепш зразумець асобным людзям сэнс свайго існавання. Адны бачаць сапраўднае шчасце ў панаванні над іншымі, у заможным жыцці; некаторыя знаходзяць яго ў мудрасці, навуцы; а нехта - у прыгажосці, цялеснай моцы; у мностве, маёмасці; у смачнай ежы, напоях, каханні; у дзецях, сябрах. Спрадвечны сэнс быцця, на думку мысліцеля, павінен заключацца ў тым, каб пераадольваць зямныя пакуты, пазнаваць хрысціянскія ісціны аб чалавеку. Хаця кожны бачыць сэнс быцця, свае шчасце ў розным, але зыход для ўсіх адзін - небыццё, таму чалавек павінен рыхтаваць сябе да жыцця у іншым свеце, - такая думка Ф.Скарыны. Пра гэта сведчаць і словы вядомага даследчыка слоўнага мастацтва Беларусі: «Дваітасць ісціны, якая ў канчатковым выніку, ставіла сцяну паміж зямным і сусветным, Ф.Скарына супрацьпаставіў іерархічную будову свету, мэтазгоднае падпарадкаванне ніжэйшых структур светабудовы вышэйшым» [20, с.217]. Гэта ярка назіраецца ў набыцці чалавекам ведаў, дзе базіснымі вылучаюцца веды, атрыманыя праз веру, а надбудовачнымі - веды, заснаваныя на чалавечым вопыце. Адсюль зыходзіць аўтарская пазіцыя адносна правоў чалавека: «Людское естество двояким законом бывает справовано: от Господа Бога, то ест прироженым, а писаным» [18, с.62].

Ф.Скарына даволі смела для свайго часу вырашыў пытанне аб арганічным спалучэнні інтарэсаў грамадства і асобы. Як і патрабавала хрысціянская этыка, ён ставіў грамадскае вышэй за асабістае, спрабаваў сарыентаваць інтарэсы індывідуўма на тварэнне «агульнага дабра», спалучэнне карыснага для ўсіх - з яго жаданнем асабістага шчасця. Адносіны ў грамадстве, паводле думак Скарыны і яго паслядоўнікаў, павінны будавацца на прынцыпах чалавекалюбства і справядлівасці. А арганізацыя такога шчаслівага жыцця ў многім залежыць ад самога чалавека, ад удасканалення яго прыроды. Пры чым аўтар перакладу Бібліі неаднаразова падкрэсліваў, што для станаўлення асобы вызначальным з'яўляецца фарміраванне яе духоўнасці.

Асобнае месца у літаратурнай спадчыне Ф.Скарыны займаюць яго віленскія выданні, што ўвайшлі ў склад «Малой падарожнай кніжкі». Сярод іх ёсць і паэтычныя творы: своеасаблівыя царкоўныя службы, якія складаюцца з панегірычных, хвалебных песнаспеваў і малітваў у гонар Ісуса Хрыста, Багародзіцы, святых - акафісты, а таксама хваласпевы, складзеныя на аснове біблейскіх песен старазапаветных прарокаў і прапаведнікаў - каноны. Усяго Скарына выдаў восем аднайменных акафістаў і канонаў, акрамя таго асобна «Канон пакаяльны», у склад якога увайшоў «Канон у суботу». Усе гэтыя творы, за выключэннем «Канона Ісусу», «Канона Крыжу Гасподняму» і «Канона пакаяльнага», суправаджаюцца малітвамі або дадатковымі тэкстамі. У «Каноне пакаяльным» адсутнічае пасляслоўе.

Даследаванне гісторыі сусветнай паэзіі дае магчымасць дакладна вызначыць крыніцы ўзнікнення і распрацоўку такіх блізкіх жанраў гімналагічнай творчасці, як акафісты і каноны. Наяунасць у творах біблейскай тэматыкі і сімволікі, спалучэнне паэтыкі гімна і жыція, складаны драматычны сюжэт набліжае іх да старазапаветнай псалмодыі. Трывалыя жанравыя асаблівасці гімналагічных тэкстаў замацаваліся ў візантыйскай духоунай паэзіі, класічныя ўзоры якой былі ўзятыя за аснову ўсходнеславянскімі гімнолагамі. Аднак у працэсе

перакладніцкай дзейнасці тэксты страцілі некаторыя свае жанравыя асаблівасці.

Па сваей будове каноны, выдадзеныя Ф.Скарынам, не выходзяць за класічныя рамкі, кожны з іх складаецца з дзевяці песняў, прычым другая па ліку песня прапушчана. У кожнай песні па два вершы, хваласпеў «Слава...», песнаспеў «И ныне...». Тэкст канона часта перабіваецца заўвагамі святару. Завяршае канон малітва «по каноне».

У выданнях асветніка канонам папярэднічаюць аднайменныя акафісты. П.У.Уладзіміраў не лічыў іх арыгінальнымі, пісаў, што, «усе гэтыя акафісты і каноны ў параўнанні іх з вядомымі кіеўскімі выданнямі акафістаў XVII стагоддзя ўяўляюць нязначныя адрозненні ў размяшчэнні і некаторых выразах» [3, с.195-196]. Гэта значыць, што Скарына прытрымліваўся адпаведных жанру нормаў і правілаў. Так, «Акафіст Іаану Прадцечы» і «Акафіст Ісусу» складаюцца з дваццаці пяці строф, якія чаргуюцца ў выглядзе кандакаў і ікасаў. Тэксты пачынаюцца трыма вершамі ў славу Іаану і Ісусу. Вершы нясуць інфармацыю аб нараджэнні святых, затым ідуць дзве страфы «Слава...», «И ныне...», пасля якіх пачынаюцца традыцыйныя кандакі і ікасы пра жыццё і смерць святых, пахвала ім. Кандак карацейшы за ікас. У ім апісываюцца кананізаваныя падзеі, кананізаваны стан душы. Ікас прадаўжае тэму кандака. Першая яго частка – абагульненне тэмы кандака, другая - хвала святым, героям акафістаў, складаецца з дванаццаці радкоў, кожны з якіх або пачыніаецца словам «радуйся», або зваротам да імя святога. Усяго кандакаў і ікасаў у кожным акафісце па дванаццаць. Да некаторых акафістаў асветнік напісаў заключныя малітвы.

Нягледзячы на тое, іто падзелу на вершаваныя радкі ў акафістах няма, іх легка можна знайсці ў тэксце.

Радуйся, ангельское житие нам являя!
Радуйся, всякому язву отгоняя!
Радуйся, взоре кротости!
Радуйся, зерцало терпливости!
Радуйся, светило неугосимое!
Радуйся, солнце праведное!
Радуйся, учителю божиих заповедей!
Радуйся, справителю многих людей!
Радуйся, истиннаго наказателю разума!
Радуйся, тайнаго подателю ума!
Радуйся, мирскую славу опустивы!
Радуйся, пустынную жызнь изволивы! [18, с. 84].

Першая частка ікаса звычайна пісалася рытмічнай прозай, дзенідзе сустракалася рыфма. Апошняя страфа найбольш падпарадкавана законам сілабічнага вершаскладання. Першы радок рыфмуецца з другім, трэці - з чацвёртым. У першым радку 15 складоў, ва ўсіх астатніх па 12. Акрамя канцавых рыфмаў «разума» - «ума», «отпустивы» - «изволивы», тут лёгка вызначыць і унутраныя рыфмы «истиннаго» - «тайнаго», «наказателю» - «подателю»; «радуйся» - рэфрэн. Па спосабу спалучэння вершаваных радкоў рыфма тут сумежная. Рыфмаваныя тэксты сустракаюцца і ў малітвах. «Падобным чынам сфарміраваных вершаў мы не сустракаем у айчыннай паэзіі ні да, ні многа пазней. Усё гэта дазваляе нам сцвярджаць, што аўтар паўстае перад намі ў зусім іншай іпастасі: ён быў паэтам таленавітым, прычым паэтам -рэфарматарам, эксперыментатарам», - піша даследчык творчасці Ф.Скарыны Я.Л.Неміроўскі [11, с. 451].

У нашым даследаванні жанры - не проста жанры, не самамэта. Нас цікавіць, як яны «праецыруюцца» на праблему «жыццё і смерць». У гэтых адносіях Скарына зрабіў важны крок наперад, стаў бліжэй да зямнога жыцця, а не нябеснага, паводле стэрэатыпаў хрысціянскага вучэння. Не магло чалавецтва заставацца на месцы у сваім філасофска-духоўным развіцці. Быў рух наперад. Быццё і небыццё ў Ф.Скарыны не зусім кананізавана. Асветнік робіць прарыў у будучыню, ставячы чалавека побач з Богам. Вера у вечнае (за «труной») жыццё не зусім трывалая. У суадносіях духу і цела выявілася вера у жыццё зямное. Эвалюцыя зместу яго твораў выявіла не чыстую, суцэльную веру ў вечнае жыццё і прызнанне чалавека не як рабскай істоты на зямлі, а моцнага, акрыленага духам. У параўнанні са сваімі папярэднікамі і сучаснікамі Ф.Скарына больш зямны. Яго каноны і акафісты трансфармаваліся філасофскім зместам у пазнейшыя оды Дзяржавіна, Сыракомлі, Купалы, Багдановіча, Танка. На сучасным этапе чалавек стварае «песні на руінах», шукае адбітак сваей дзейнасці у духоўнасці, у гарманізуючай аснове. Чалавек вяртаецца да Бога, але не як Сімвала, Іерогліфа, Умоўнага Знака, а як да рэаліі, сінтэзу лепшых памкненняў жыхароў Сусвету і Космасу, Зямлі і Неба. Пра тое, як зямны і нябесны пачаткі яднаюцца у чалавеку - уся сучасная літаратура. А Скарына ж два гэтыя пачаткі імкнуўся паяднаць.

***Філасофская канцэпцыя М. Гусоўскага.*** У адрозненне ад Ф.Скарыны інтэрпрэтацыя быцця і небыцця у творчасці Міколы Гусоўскага грунтуецца на больш натуральным, свецкім падыходзе да праблемы вытлумачэння рэчаіснасці на даволі паслядоўным адмаўленні звышнатуральнага і фантастычнага. Паказальнай у гэтым плане з'яўляецца яго паэма «Песня пра зубра».

Мабыць усім забабонам любога народу
Рыса ўласціва адна: невядомае у свеце
Звышнатуральнаю сілай тлумачыць - і кропка...
Я ж не прыхільнік згадак і розных фантазій,
Тое пяру давяраю, што сам неаднойчы
Бачыу, паверыў, зрабіў - свой мазолісты вопыт [5, с. 133].

На шляху да спасціжэння ісціны аўтар не рызыкуе абагульняць цьмяныя думкі, здагадкі, выпадковыя сітуацыі, а надае значную перавагу неаднаразовым асабістым назіранням і перакананням, заснаваным на спасціжэнні агульначалавечага вопыту. Непасрэдная сувязь з простым людам на паляваннях дазволіла паэту больш арганічна, параўнальна са Скарынам, звязаць духоўнае самапазнанне і самасцвярджэнне асобы са звычайным штодзённым жыццём. Чалавек, узброены інтэлектуальнымі дабрачыннасцямі, у адпаведнасці з канкрэтнымі абставінамі, сцвярджае мастак слова, сам вызначыць характар сваіх паводзінаў, бо нават знешне смелы ўчынак не заўсёды можна расцаніць як храбры. Таму гнеўна асуджае ён забаўляльныя ловы, пры якіх гінуць людзі, і станоўча ацэньвае паляванне як сродак падрыхтоўкі воінау або як крыніцу сапраўднага чалавечага існавання. Тут жа аўтар паэмы паказвае перавагу калектывізму перад адзіноцтвам на прыкладзе жыцця зубрынага статку; перавагу розуму над сілай, чалавечай годнасці над палахлівасцю і няспрытнасцю у барацьбе з параненым зубрам:

Твой абавязак - і справу сваю і бяспеку
Сам барат, бо сваімі рукамі трымаеш
Дзіду ці лук ды і лёс. Не утрымаеш - загінеш [5, с. 136].

Прыведзеныя радкі сведчаць пра тое, што, паводле Гусоўскага, фарміраванне індывідуальнага пачатку ў чалавеку арыентавана, у першую чаргу, на выпрацоўку натуральнага і цэласнага яго дачынення да сябе самога, усведамлення ім сябе кропляй агульнага лёсу чалавецтва. Наколькі гэта актуальна, сведчыць і сцэна палявання, і сцэна навалы з усходу, і многія іншыя.

Філасофская канцэпцыя чалавека у творчасці М.Гусоўскага актуальная і сёння тым, што ў ёй канкрэтызавана уяўленне аб ім як аб суб'екце гісторыі, адказнага на узроўні ментальнай індывідуальнасці за лес бацькаўшчыны. Таму асноўную задачу мысліцель бачыў у неабходнасці азнаёміць з Беларуссю як мага большую колькасць еўрапейцаў, расказаць ім аб бедах і праблемах сваёй радзімы. Праз асацыятыўную паралель «карыда - паляванне на зубра» ён міжвольна набліжае Беларусь да краін Заходняй Еўропы, у якіх існуюць падобныя рыцарскія турніры.

Радзіма у паэме для чалавека - пачатак пачаткаў, выток усяго самага святога і дарагога у кожнай асобе і прадвызначае сэнс жыцця суайчыннікаў:

Час патрабуе аднак падумаць над бедствам айчыны,
Як нам яе падтрымаць, чым аднавіць яе моц [6, с.23].

Занепакоены лёсам роднай краіны, паэт не мог не марыць аб яе модным і таленавітым кіраўніку. Ідэал такога дзеяча ён бачыў у асобе князя Вітаўта, які займаўся не толькі праблемамі бяспекі Вялікага княства Літоўскага, але і прававымі пытаннямі:

Мужныя справы тады адзначаліся дзякай належнай,
Шчодра адорваў князь вояў, дастойных пахвал.
Пудкасць, няхай і паноў, знявагу ў яго выклікала,
Строга й сурова караў звычкі дурныя людзей.
Ён справядлівасць любіў, шанаваў яе нормы святыя,
Не дазваляў, каб махляр дзесьці абходзіў закон.
Як ужо ў суд выклікау, то большая колькасць віноўных
Самі губілі сябе, толькі не йсці б да яго [6, с. 36-37].

Самакаштоўнасць асобы, вечнасць яе справаў паказаны праз лёс князя Вітаўта. І далей аўтар робіць спробу выхаду на праблему «жыццё і смерць», сцвярджаючы, што жыццё не мае поўнай самакаштоўнасці, смерць - натуральная з'ява для рабоў.

Расказваючы пра князя, паэт паказвае працавітых і гаспадарлівых людзей, іх звычаі, вераванні, традыцыі. Асабліва жахлівымі паўстаюць сцэны спальвання або таплення ведзьмаў, якія ярка перадаюць характар народа ў барацьбе з перажыткамі язычніцкай ідэалогіі.

З берага ж хмара народу галёкае, свішча,
Плача і стогне і кленічы шле у паднябессе [6, с. 130].

Знаходзячыся ў лабірынце памылак, народ прагне растлумачыць сілу замоваў і траваў, магіі слова, спасцігнуць ісціну, што спластавалі вякі, але заблудзіўся ў пацёмках, верачы толькі ў Ісуса Хрыста: «Мы - яшчэ натоўп, грамада непісьменная, цемра» [5, с. 130].

Як адданага сына роднаму краю, паэта хвалююць беды і пакуты беларусаў. Прычыну іх гаротнага становішча ён бачыць у тым, што ўсе, хто мог бы заступіцца за простых людзей, глухія да іх.

Згодна з хрысціянскай канцэпцыяй, чалавек не можа панаваць над светам. Гісторыя ведае шмат прыкладаў, калі мацнейшыя дзяржавы ваявалі слабейшыя, але цярпелі паражэнні. Так у свой час Аляксандра Македонскага спыніў Дунай, рымлян -Германія, мангола-татараў і туркаў - рускія і беларускія землі.

Водгукам на падзеі, што хвалявалі ўсё тагачаснае грамадства, стала паэма М.Гусоўскага «Новая і слаўная перамога над туркамі ў ліпені месяцы». Твор насычаны патрыятычнымі памкненнямі простага народа, ставіць жыццё вышэй за смерць. Нават доблесныя старцы папаўнялі рады апалчэнцаў, тыя, у каго «длань уж немощна не цепко сжимает меча рукоять" [16, с. 204]. Толькі нельга стрымаць хуткацечнасць часу, яна не дазваляе сабраць войска роўнае варожаму. Дый стомным здаваўся няблізкі шлях да ратнага поля. Народ ведае, што усякая вайна нясе зло. Не выключэнне і гэтая: парабаваны гарады, спустошаны нівы, пакалечаны і знішчаны людзі

Оком поля не окинешь, врагом разорённые нивы.
Толпы страдальцев в неволю сгоняют, отёкших от пут...
Кровью народ истекает, в стенаниях, слезах потонув [16, с. 204].

Здзекі мангола-татараў над неабароненымі і безабароннымі мірнымі жыхарамі прыводзяць некаторых да адчаю. Асабліва ўражваюць яго пакуты народа, ад якіх пахіснулася вера у Хрыста. Простыя людзі чакалі ад святых дапамогу, але вораг застаўся непакараны. Тады цені надзеі на перамогу, на вяртанне да свабоды памерклі. Сяляне пачынаюць маліць багоў, наракаць на іх і мовіць, каб у няшчасныя дні не пакідалі народ сам - насам з бядою. Зноўку гучаць папрокі ў тым, што святыя засталіся глухімі да просьбаў людскіх. У сэрцах людзей пашыраецца невыносны боль, скарга на Бога, расце недавер, з вуснаў зрываецца нават лаянка, гучаць брыдкія словы:

Вот, обезумев, отец восклицает, хуля: "Отрекаюсь,
Для Магомета от бога распятого Римом - Христа!
Пусть бы вернул Магомет мне родных, похищенных силой,
Без дорогих не вернусь, не увижу я света, умру!
Знал я и прежде, что лучше Христа управлять ты умеешь,
Кто же посмеет пред силой могучей такой устоять? [16, с. 204].

Толькі Богу усявышняму вядомы зыход жорсткай бітвы. Самаaддана ліцвіны вядуць абарону горада, з пагардай ставяцца да замкнутай у гарадскіх сценах самаабароны. Ім бы на полі шырокім разгарнуцца, дзе можна паказаць, на што здатны кожны воін, упэўніцца, што яны - сіла, яны - моц. Гарадскія сцены сціскаюць, не даюць магчымасці праявіць свой спрыт, ударыць усёю магутнасцю. Кровапраліцце, гібель суайчыннікаў надае воінам яшчэ большай нецярпімасці да прышэльцаў. На дапамогу воінам узнімаюцца натоўпы сялян.

Дзеянні і паводзіны ўсявышняга ў паэме М.Гусоўскага нагадваюць жыццё і дзейнасць Ісуса Хрыста у біблейскай аповесці: на пачатку была вера народа і пахвала (нараджэнне Ісуса), знявага і праклён у кровапраліццях (распяцце сына божага), перамога над ворагам, вызваленне (уваскрашэнне Хрыстова).

Яшчэ адна асаблівасць твора заключаецца у супрацьпастауленні аўтарам веры народа і яго адчаю - гэта павевы духу рэалізму, філасофскага асэнсавання каранёў рэлігійных перакананняў у народзе.

Ідэя паэмы - перамога людзей над абставінамі. Ёю пазней і пачаў падпітвацца -наталяцца экзістэнцыялізм. Экзістэнцыялізм - вера у сілу духа чалавека, у перамогу ім абставінаў. Паэма і узвялічвае гэта, як і творчасць М.Гусоўскага у цэлым. Перачытваючы зноў і зноў яго вершы перадсмяротнай пары, яго паэмы бачым жыццясцвярджальную, чалавекасцвярджальную іх сілу. А гэта і ёсць апафіёз жыцця над смерцю.

Сапраўдным гімнам зямному быццю, упарадкаванасці, мэтанакіраванасці і узаемазвязанасці ўсяго таго, што створана дзеля жыцця чалавека, паўстае перад намі паэма М.Гусоўскага "Жыццё і ўчынкі святога Іакінфа". Задумваючыся над сэнсам чалавечага жыцця, аўтар прыходзіць да выніку, што чалавек як галоўнае тварэнне Бога на зямлі жыве ў спрадвечна арганізаваным свеце дзеля свайго шчасця, якое у значнай ступені залежыць не толькі ад узроўню асабістага развіцця, але і ад адносін з іншымі людзьмі. На зямлі ўсё створана так, каб кожны чалавек згодна з асабістымі поглядамі мог удасканальваць сваю прыроду.

Нет ничего на земле, чтоб создано было не для счастья.
Звёзды мерцают во тьме, освещают сиянием слабым,
Мощью таинственной; пыль золотистую в воздухе чистом
Воспоминаешь с восторгом...
Нет ничего, чтоб напрасно возникло. Подумаешь только,
Всем человек наслаждается, всё ему пользу приносит... [7, с. 34].

Адным з асноўных крытэрыяў у ацэнцы маральнасці чалавека з'яуляецца пачуццё асабістай адказнасці перад людзьмі. Носьбіт такога крытэрыю у паэме - вобраз Іакінфа, які выступае сімвалам барацьбы дабра і зла. Тэма служэння агульнаму абавязку цесна сплятаецца таксама з матывамі асабістага смутку паэта-падзвіжніка. У лісце да біскупа пярэмышльскага Яна Карнкоўскага ён піша: "Пераадольваючы сум, як магу, я падбадзёрваю сябе заняткамі заўжды пішу што-небудзь альбо чытаю, каб не адпачывала галава, калі паралізаваны ногі" [7, с. 42].

У заключнай частцы твора, як і ў "Песні пра зубра", паэт звяртаецца да богамаці з надзеяй вымаліць краю заступніцтва, паказаць народу выйсце з жахлівага становішча.

Пакуты прыціснутых горам людзей, малітвы аб выратаванні, безнадзейнасць і адчай, выкліканыя стыхіяй, пратэст супраць адраджэння язычніцкіх звычаяў, супраць абыякавасці ўладароў да простага народа - асноўныя матывы вершаў М.Гусоўскага.

Будучы у складзе польскага пасольства у Рыме Мікола з Гусава стаў відавочцам страшэннай трагедыі, што узнікла у горадзе, - успыхнуўшай эпідэміі чумы - стыхіі жыцця. Убачанае і перажытае паслужыла паэту сюжэтам для вершу "На ахвярапрынашэнне чорнага бычка", "Песня да набожнага Севасцьяна", "Слух у царкве святога Лаўрэнцэя у Дамасе", "Малітва да святой Ганны". Усе гэтыя творы напоўнены асуджэннем страху і панікі гараджан, прагай барацьбы з усеагульным хаосам, імкненнем пераадолець адчай, упарадкаваць стыхію жыцця.

У вершы пра чорнага бычка мысліцель асацыятыўна аднаўляе гісторыю старажытнага. Рыма, сусветнавядомыя памятныя месцы, славутасці яго насельнікаў, патомкаў готаў, Лацыя, дабрачыннасць рыцараў; і выгляд горада у час стыхіі са слядамі запечанай крыві на вуліцах, апаганенага ўсяго святога там, дзе яно ўзнікла. Горад, якому наканавана быць абаронцам хрысціянскай веры, прыкладам набожнасці, застаўся пакінутым на волю лесу духавенствам і знаццю. Не дапамаглі яму выстаяць перад чумой і апекуны, мошчы святых, што пахаваны ва усыпальніцах храмаў. Разам з тым выкліканы хваробай голад парушыў у сэрцах людзей надзею на веру ў запаветы хрыстовы, у рэальнасць існавання Бога. Аслаблены горад застаецца даступным для нашэсця ворагаў. Змораныя жыхары выносілі іконы, чакалі, пакуль з неба сыдзе знак міласці, паддаваліся розным цудадзейцам і ведзьмакам. Адным з такіх быў Дзмітрый Спартакус, які раіў вярнуцца да старажытнага звычаю ахвярапрынашэння чорнага бычка з адрэзаным да палавіны рогам. Язычніцкія закляцці пахіснулі, збілі з праўдзівай дарогі народ, прымусілі адступіцца ад веры, грэбаваць хрысціянскімі абрадамі і кланяцца чорным бычкам, злым пачварам апраметнай.

Дьявольским смрадом наполнить ты храм готов неужели,
Город, с молитвой к скотине, поклоны чудовищу класть?
Значит не думаем больше о помощи неба и спаса,
Ложны заветы религии нашей, а вера обман? [16, с. 199].

Аўтар прызывае гараджан звярнуцца да мудрасці продкаў, да іх нораваў, каб перад тварам усяго свету змыць ганебныя плямы з сумлення людскога. Ён просіць апостала Пятра, які заняты распаўсюджваннем хрысціянскай веры сярод чужаземных народаў, вярнуцца ў горад з мэтай вылечыць народ ад маральнага разладу, лічыць, што чалавечая мудрасць пры падтрымцы усявышняга зможа не дапусцуць, каб народ кануў у небыццё.

Папрокам святым у несправядлівасці неба да нявінных ахвяр, папрокам супраць жорсткага лесу гучыць голас паэта у вершы "Песня да набожнага Севасцьяна".

Разве скажешь, страж племенам романским,
Грозный наш отец, что погасил милость?..
Наше горе скрыть пожелаешь в тайне?
Слушать хочешь стон человечий в суе и не ответишь? [16, с. 199].

Ён заклікае апекуна і заступніка ад заразы Севасцьяна зменшыць пакуты людзей, не быць раўнадушным да зла, якое творыцца на зямлі. Але нават святыя не ў сілах вызваліць народ ад бестыі: ні Севасцьян з "Песні да набожнага Севасцьяна", ні папа Адрыян VI з "Слуху ў царкве святога Лаўрэнція ў Дамасе", ні святая Ганна, маці дзевы Марыі з "Малітвы да святой Ганны". Такім чынам, мы бачым, што паэт прыклаў вялікія намаганні для таго, каб паказаць уладарам і святошам простага чалавека як вартага лепшай долі і глыбокай павагі.

"Мікола Гусоўскі не поўнасцю пераадолеў пастулат сярэдневяковай этыкі, якая тлумачыла заганы людзей існаваннем абстрактнага зла на зямлі. Паэт спрабуе прымірыць пакорлівасць і гордасць, аскетызм і жыццярадаснасць. У яго светапоглядзе можна вылучыць ідэі, навеяныя ўплывамі Захаду і Усходу, тэалогіі і гуманізму, старажытнасцю і ўжо блізкай эпохай Новага часу. Аднак істотным было тое, што паэт не адрываўся ад жыццёвых рэалій" [2, с. 19-20], - адзначае В.С. Болбас. Далучэннем М.Гусоўскага да мысліцеляў Новага часу з'явілася сцверджанне ім духоўнай свабоды чалавека, хоць і абмежаванай у веры, устанаўленне ісціны, што падманваюць не прырода і звышнатуральныя сілы, а людзі людзей. Яму ўдалося пахіснуць усясільнасць рэлігійных догмаў, аўтарытарызм не толькі духоўных, але і свецкіх уладароў, уняць ролю кожнага індывідуўма ў імкненні да агульначалавечага дабра. "Традыцыя Гусоўскага можа быць прасочана па ўсёй старажытнай беларускай літаратуры - гэта абарона ўстояў патрыярхальнага гістарычнага жыцця, якое дало змест народнаму эпасу. На гэтым трымаецца беларуская казка і прагрэсіўная рамантычная плынь беларускай літаратуры", - адзначае У.А. Калеснік [8, с. 194].

М.Гусоўскі "жыццё і смерць" спавіў рэаліямі, апусціў праблему з нябёсаў на зямлю. Размежаваў, зрабіў палярнымі гэтыя паняцці. Асудзіў смерць як акт злачынства як для чалавека, так і для жывых істот (смерць зубра у фінале паэмы). Апошняя сцэна -забойства зубра - вынік смерці ненатуральнай, жорсткай, "гвалтоўнай". Філасофскі аспект заключаецца ў тым, што ён не проста спачуваў беларусам, а змагаўся за рост іх самаўсведамлення, самакаштоўнасці, самаацэнкі. А гэта праявы будучага экзістэнцыялізму.

***Лацінамоўная паэзія Яна Вісліцкага.*** Блізкім па духу Ф.Скарыне і М.Гусоўскаму быў лацінамоўны паэт Беларусі і Польшчы Ян з Вісліцы. "Яны жылі ў адзні час, іх творы дапаўняюць адзін аднаго, адлюстроўваючы розныя бакі жыцця Беларусі пачатку XVI стагоддзя. Ніводнаму з іх не давялося жыць і працаваць на Радзіме, якую апелі ў сваіх творах. Тэматыка іх: народ даб'ецца шчасця у барацьбе з ворагам і невуцтвам" [13, с. 3], - піша Я.Парэцю. У беларускую адраджэнскую літаратуру паэт увайшоў як аўтар шэрагу од, іншых жанраў "узнёслага пісьма" і, канешне ж, паэмы аб Грунвальдскай бітве 1410 года "Пруская вайна". Ужо у ранніх яго творах "Элегія да багародзіцы дзевы Марыі і спыненні заразы", "Эпіграма на зайздросніка", "Ода да караля Польшчы пра яго бітву са скіфамі і перамогу над імі, шчасна атрыманую 8 верасня 1514 года" выявілася аўтарская пазіцыя ў адносінах да праяваў тагачаснага жыцця, да веры Хрыстовай, да гераічнага мінулага свайго народа, да вырашэння тых праблемаў, што дасягнулі свайго эпагею у "Прускай вайне".

Сама назва паэмы раскрывае асноўную задуму Я.Вісліцкага: даказаць, што толькі абапіраючыся на волю народаў Польшчы і Літвы, на іх сумесныя дзеянні, можна адолець ворагаў, якія пасягнулі на мірнае і свабоднае жыццё, і гэтымі ворагамі з'явіліся германцы. Пафас твора - глыбокае патрыятычнае пачуццё, любоў да радзімы, якую паэт увасабляў як апору народаў, што ненавідзелі вайну, але здолелі абараніць свабоду, адстаяць сваю незалежнасць. Паэта вабіць перш за ўсё мэтанакіраванасць у аднаўленні падзей мінулага, павучальных для наступных пакаленняў. Яго патрыятычныя пачуцці абражае недаацэнка сучаснікамі ўрокаў, паднесеных гісторыяй, абурае настрой польскіх магнатаў, якія шукаюць лёгкую здабычу на ўсходзе.

Чым жа была Радзіма сармацкаму паэту? Радзіма у Я.Вісліцкага - гэта гучным імем праслаўлены край пад паўночнай зоркай, дачкой бацькі Дыкаона, гэта неабсяжныя прасторы, што занялі паўсвету. Калі параўнаць Радзіму ва ўяўленнях М.Гусоўскага і Я.Вісліцкага, то атрымаем аналогію. У першага - гэта край пад Палярнай зоркаю, у другога - пад Мядзведзіцай.

Беларусы паказаны у паэме як смелыя ваяры, руплівыя сяляне, "харобрыя" лучнікі. Больш шырока яны раскрываюцца у вобразах князя Вітаўта і караля Ягайлы, якія ўвасабляюць народны гераічны ідэал воінаў-міралюбцаў, характары моцных духам людзей.

Сэнс жыцця паэт бачыў у здзяйсненні чалавекам свайго зямнога подзвігу, на прыкладзе караля Ягайлы, у актыўнай дзейнасці ўсіх беларусаў, дзе яны змаглі праявіць сваю мужнасць, веданне справы, доблесць, талент, высакароднасць, змаглі ўзвысіць прыроднае ў сабе да боскага дзякуючы свайму розуму. Такое светаразуменне і прывяло Я.Вісліцкага да новага раскрыцця сэнсу жыцця.

"Мэта, якую паставіў перад сабой паэт, далека выходзіла за рамкі дзеянняў Ягайлы. Паэт хацеў павярнуць палітыку Жыгімонта супраць ордэна, які падымаў галаву, і паказаць злачыннасць паходаў на Усход", - сведчыць Я.Парэцкі [13, с. 32].

Паэма густа насычана міфалагічнымі вобразамі, іншы раз несумяшчальнымі. Так, каралю Ягайлу у вайсковых справах дапамагае хрысціянскі бог, а антычныя паганскія багі выбіраюць яму ў жонкі Соф'ю Гальшанскую, беларуску.

Як М.Гусоўскі "Песню пра зубра", так Я.Вісліцкі "Прускую вайну" завяршае выступленнем супраць вайны і заклікам да шчаслівага мірнага жыцця.

Своеасаблівай з'явай старабеларускага творчага літаратурнага працэсу становіцца панегірычны - ухвальны твор у гонар нейкай асобы, грамадскай з'явы, святых. Затым ён пашырыўся і на свецкую глебу. Сталі частымі вершы "На герб...". Іх называлі эпіграмамі - расшыфроўкамі сімволікі магнатаў. Сімволіка была адбіткам заслуг, якія набывалі перад дзяржавай прадстаунікі пэўнага заможнага роду.

Ухвальныя верніы пісаў пры дварах Андрэй Рымша: "На герб пана Валовіча", "На герб Тэадора Скуміна", "На герб Льва Сапегі". Ён паказаў, якімі якасцямі павінен валодаць сапраўдны грамадзянін дзяржавы. У яго эпіграмах вымалёўваецца думка пра хуткацечнасць чалавечага існавання, якая пераадольваецца ўяуленнем пра вечнасць славы. Аўтар узвышае гонар, смеласць чалавека, яго вернасць традыцыям роду, патрабуе, каб успаміны аб такой асобе былі зафіксаваны у гісторыяграіі і мастацтве.

Такім чынам, эпоха Адраджэння - пераломны этап у грамадскім і эстэтычным жыцці. Ідэалагічная сутнасць яго ў пераходнасці ад феадалізму да капіталізму: раслі гарады, развіваліся рамёствы, што і паслужыла ўзлёту літаратуры, дэкаратыўнага мастацтва.

У сваім філасофска-багаслоўскім вучэнні С.Полацкі прытрымліваўся наступных ідэй: свет створаны з матэрыі; свет падзелены на тры часткі: першавобразны свет (Бог), большы (прырода і чалавек). Адмаўляючы пазнавальнасць Бога, ён аддаваў прыярытэт пазнанню прыроды праз свецкія веды.

Сэнс чалавечага жыцця, па С.Полацкаму, не можа заключацца у багацці, так як яно параджае зайздрасць, а ў выніку узнікаюць спрэчкі, войны, гнеў і нараджаецца ўсялякае зло. Вайна сама сабой спрыяе развіццю драпежніцтва, убоства, жабрацтва. Беднасць забірае ў чалавека даверлівасць, вучыць цярплівасці. Знатнасць роду і сапраўдная высакароднасць вызначаецца у бацькоўскім стварэнні атмасферы карэннай роднасці і ў выпрацоўцы старэйшымі правільных, гуманных асабістых паводзінаў чалавека. Паэт-мысліцель прытрымліваецца думкі, што багацце матэрыяльнае разбэшчвае не толькі асобу, якая ім валодае, але і выклікае амаральныя паводзіны акружаючых:

Почести и украшения пред славой шествуют,
Блюдолизы за кубком её следят.
Льстец у ног славного садится,
Никогда от зависти всяческой не избавится [15, с. 96].

У аснове усіх даброт на зямлі, лічыць С.Полацкі, ляжыць стваральная праца чалавека: "Ибо старательным трудом всего достичь можно" [15, с. 174].

С.Полацкі адмауляў наяўнасць прыроджаных ідэй, лічыў, што ўсе веды чалавек чэрпае з "мора жыццёвага". Пачаткам усякага пазнання, на яго думку, з'яуляюцца пачуцці, але значную ролю ён адводзіў чалавечаму розуму, яго мысліцельнай здольнасці.

О вечном заботься, разумом пребывай в небе:
Счастлив тот, кто мир от себя отринет [15, с. 194].

Увесь жыццёвы шлях чалавека С.Полацкі падзяляе на пяць шаснаццацігадовых прамежкаў: урачыстае выхаванне, пошук крыніцы існавання ад сваей працы, абмен ведамі, згасанне жыццё-

вых інтарэсаў, вяртанне чалавека да небыцця, з якога ён прыйшоў у зямное жыццё. Нядоўга шчасце асалоды чалавечай працягваецца на гэтым свеце, яно часовае, таму хутка знікае. Хай сабе ты кароль ці "чэрнь", усё роўна павінен пакінуць зямное жыццё. Прысутнасць чалавека на зямлі - замкнёнае кола вечнасці: ён узнікае з "нічога" і ператвараецца у "нішто".

Человек есть пузырь, стекло, лёд, небылица, прах, сенно,
Сон, грош, глас, звук, ветер, цветок,
Ничто чтоб его и королём называли [15, с. 194].

***Заключэнне.*** Адметнасць філасофска-паэтычнай думкі ў Беларусі перыяду XVI - XVIII стагоддзяў была абумоўлена шматлікімі фактарамі грамадскага жыцця, агульным узроўнем набытага духоўнага патэнцыялу. Гэта быў перыяд дэскрыдытацыі феадалізму, манаполіі каталіцкай царквы на адукацыю, выхаванне, навуку. Канцэпцыя класіцыстаў адносна праблемы "жыццё і смерць" стройная і строгая; сучаснасць настойвае на яе новай духоўнасці, новай веры у "затруннае" існаванне. Так, у А.Разанава: чалавек і рэчы - узаемапранікальная з'ява, непарушная цэласнасць. Дух -неўмiручы. А у С.Полацкага "цвярозы погляд" на існасць: цела - нішто, з нічога (матэрыялістычны погляд). А дух? С.Полацкі даў форму сучасным аўтарам, натхніў іх на пошук ісціны без рэлігійнай кананізацыі. Чалавецтва у сваім руху наперад ішло ад фетышызму (прызнання рэчаў як сабе падобнай існасці) да прызнання валадарання над сабой звышрэальных сіл, затым - Бога, а пазней - прызнання сябе у самім сабе, сваей самакаштоўнасці, адлучанасці ад боскасці, міфізму і выпрацоўвала матэрыялістычны погляд на рэчаіснасць, на жыццё і смерць. Вяршыня пошукаў у гэтых адносінах – творчасць і філасофскае мысленне С.Полацкага, яго стыхійна-рамантычны погляд на жыццё і смерць.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Біблія: Факс, узнаўленне Бібліі, выд. Ф.Скарынам у 1517 - 1519 гг.: У 3 т. - Мн.:БелСЭ, 1990-1991.
2. Болбас В.С. Маральна-выхаваўчы патэнцыял спадчыны М.Гусоўскага// Беларуская літаратура. - Мн.: Універсітэцкае, 1992. - Вып. 20 - С. 10-20.
3. Владимиров В.П. Доктор Франциск Скорина. Его переводы, печатные издания и язык. - СПб.: Университетское, 1888. - С. 195 - 196.
4. Голенищев-Кутузов И.Н. Итальянское Возрождение и славянские литературы XV - XVI веков. - М.: Изд-во АН СССР, 1963.
5. Гусоўскі М. Песня пра зубра// Старажытная беларуская літаратура: Зборнік. – Мн.: Юнацтва, 1990.
6. Гусоўскі М. Песня пра зубра. - Мн.: БГАЦК, 1994.
7. Дышыневич В. Голос из XVI века// Свитязь: Альманах библиофилов Белоруссии. - Мн.: Беларусь, 1989. - С. 29 - 43.
8. Калеснік У.А. Тварэнне легенды. - Мн.: Маст. літ., 1977.
9. Калеснік У.А. "Трэба, каб мір для жывых запанаваў на зямлі // Рэспубліка. 1992, 8 кастрычніка.
10. Лабынцаў Ю. Пачатае Скарынам: Беларус. друк. літ. эпохі Рэнесансу/ Пер. з рускамоўн. арыг. С.Шупы. - Мн.: Маст. літ., 1990.
11. Немировский Е.Л. Франциск Скорина: Жизнь и деятельность белорус. просветителя. - Мн.: Беларусь, 1990.
12. Падокшын С.А. Філасофская думка эпохі Адраджэння у Беларусі - Мн.: Вышэйш. школа, 1990.
13. Парэцкі Я.І. Ян Вісліцкі - Мн.: Універсітэцкае, 1991.
14. Парэцкі Я.І., Прэнская Ю.І. Паэма Яна Вісліцкага "Пруская вайна" // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства. - Мн.: Выд. БДУ, 1973. - Вып. 1. - С. 161 -165.
15. Полоцкий С. Вирши - Мн.: Маст. літ., 1990.
16. Порецкий Я.И. «Победа над турками» Н. Гусовского// Вопросы филологии. - Мн.: Вышэйш. школа, 1973. - Вып. 3. - С. 196 - 206.
17. Скарына Ф. Зборнік дакументаў і матэрыялаў / [Прадм., уклад., камент., паказ В.І. Дарашкевіча] - Мн.: Навука і тэхніка, 1988.
18. Скарына Ф. Творы: Прадмовы, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. - Мн.: Навука I тэхніка, 1990.
19. Турилов А.А. Гимнографическое наследие Франциска Скорины в рукописной традиции // Проблемы научного описания рукописей и факсимильного издания памятников письменности - Л.: Нева, 1981. - С. 241 - 247.
20. Яскевіч А. "Жадал еси собе мудрости" // Полымя. 1991. - № 6. - С. 217.


*Материал поступил в редакцию 23.11.2007*

**LIAVCHUK V.A. The philosophical conception of a human in the renaissance and barogue poetry of Byelorassia**

The conception of a man in the barogue and in the renaissance poetry of authors and the models of existence, which are corresponding to the conception of a man, are scrutinized in the article. A special attention is paid to the problems of existence and of non-existence, to the sense of humane life, to the freedom of personality, to the theme of native country on the example of creation of such authors as Fr. Skoryna, M. Gussowskij, E. Vislytskij and S. Polotskij.